# Тураўскае княства

## Гісторыя Беларусі, VI клас

**Г. М. Міксюк-Ладыжанка**, настаўнік гісторыі Скараднянскай сярэдняй школы Ельскага раёна Гомельскай вобласці

**Мэта:** вызначыць асаблівасці палітычнага развіцця Тураўскай зямлі ў X–XII стст.

**Задачы:**

- даведацца аб асаблівасцях геаграфічнага размяшчэння старажытнага Турава;
- засвоіць веды аб абставінах узнікнення Турава і Тураўскага княства;
- вызначыць характар адносін Турава з Кіевам у канцы X — першай палове XI ст.;
- даведацца аб часе і абставінах здабыцця Тураўскім княствам незалежнасці;
- засвоіць факт вылучэння на першае месца ў Тураўскім княстве горада Пінска.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.: вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. Ч. 1 / Ю. М. Бохан, С. М. Цемушаў; пад рэд. Ю. М. Бохана. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2016; атласы; раздатачны матэрыял; мультымедыйная прэзентацыя.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

Праверка прысутнасці вучняў на уроку. Арганізацыя працоўнага месца. Псіхалагічны настрой вучняў на працу.

**II. Актуалізацыя атрыманых ведаў.**

Настаўнік прапануе рашыць дзве крыжаванкі, якія складаюцца з 16 пытанняў. Пасля разгадвання крыжаванак вучні даведваюцца, як гучыць тэма урока (запіс у сшытку «Тураўскае княства»). Праводзіцца карэкцыя ведаў.




https://gisdapamoga.bspu.by/

1. Ад назвы якой ракі атрымаў сваё імя горад Полацк.

2. Полацкі князь, сын Брачыслава, якога празвалі Чарадзеем.

3. Кіраўнік праваслаўнай царквы, які знаходзіўся ў Кіеве.

4. Варажскі князь, які ў 960-я гады усталяваў уладу ў Полацку.

5. Сын Рагнеды і Уладзіміра.

6. Галоўная або самая вялікая царква горада.

7. Сухапутная частка воднага гандлёвага шляху, па якой даводзілася цягнуць караблі.

8. Сталіца буйнога княства, упершыню ўзгадваецца ў летапісе пад 862 г.

9. Сход дарослых свабодных мужчын, які склікаўся для вырашэння важных спраў.

10. Правадыр племені, уладар княства.

11. Рака, на якой 3 сакавіка 1067 г. адбылася вырашальная бітва паміж князем Усяславам і князямі Яраславічамі.

12. Нашчадкі родавай знаці ў Кіеўскай Русі, старшыя дружыннікі і ўплывовыя землеўласнікі.

13. Старэйшы сын Уладзіміра Манамаха.

14. Кіраўнік роду або племені, самы вопытны і звычайна стары чалавек.

15. Самы буйны ўсходнеславянскі саюз плямёнаў.

16. Дачка Рагвалода.

**Адказы**

*1. Палата. 2. Усяслаў. 3. Мітрапаліт. 4. Рагвалод. 5. Ізяслаў. 6. Сабор. 7. Волак. 8. Полацк. 9. Веча. 10. Князь. 11. Няміга. 12. Баяры. 13. Мсціслаў. 14. Старэйшына. 15. Крывічы. 16. Рагнеда.*

**III. Этап пастаноўкі мэтаў і задач.**

Настаўнік прапануе вылучыць, на што неабходна звярнуць увагу пры вывучэнні новай тэмы, што вучні даведаюцца на ўроку. Гучыць сумесная фармуліроўка, якая запісваецца на дошцы. Ставіцца пытанне, на якое патрэбна будзе адказаць у канцы занятка: «Ці можна Тураўскае княства лічыць дзяржавай?»

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Старажытны Тураў.***

Спачатку паведамляецца, што горад Тураў быў заснаваны на зямлі, дзе жылі дрыгавічы. Вучні характарызуюць геаграфічнае становішча Тураўскага княства (работа з атласам) і вызначаюць, як такое становішча магло паўплываць на развіццё дзяржавы.

Настаўнік называе дату першага пісьмовага ўзгадвання Турава — 980 г., паведамляе, што вядома пра князя Тура з летапісу, расказвае, як кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч накіраваў свайго сына Святаполка ў якасці намесніка ў Тураў. Заслухаўшы паведамленне настаўніка, вучні запісваюць у сшытак дату 980 г., імя першага вядомага летапіснага тураўскага князя — Тур.

***2. Адносіны паміж Туравам і Кіевам.***

Настаўнік паведамляе, каму дасталося Тураўскае княства ў пачатку XI ст., адзначае, што кіеўскія князі захавалі за сабой правы княжыць у Тураве. Вучні працуюць з генеалагічнай схемай «Старажытнарускія князі» (вучэбны дапаможнік, с. 96), знаходзяць на схеме князёў, якія займалі княжацкі прастол у Тураве.

***3. Як Тураўскае княства набыло самастойнасць.***

Настаўнік расказвае пра тураўскага князя Юрыя Яраславіча і яго ролі ў абароне Тураўскага княства ад войска кіеўскага князя Ізяслава Давыдавіча. Потым прапаноўвае вучням прачытаць матэрыял рубрыкі «Цікава ведаць» (вучэбны дапаможнік, с. 98) і выканаць заданні.

- Дайце назву урыўку з летапісу.
- Назавіце ўдзельнікаў падзеі.
- Пра якую падзею расказваецца ў летапісе?
- Што дазволіла Юрыю Яраславічу перамагчы моцнага ворага?

Вучні запісваюць у сшытак дату абароны Турава ад войска кіеўскага князя — 1157 г., імя тураўскага князя — Юрый Яраславіч.

***4. Гарады і воласці Тураўскай зямлі.***

Вучням паведамляецца, што ў Тураўскай зямлі вылучыліся воласці (Пінская і Дубровіцкая), расказваецца пра горад Пінск, ролю, якую ён адыграў у гісторыі Тураўскага княства. Вучні запісваюць у сшытак год першага ўзгадвання Пінска ў летапісе — 1097 г.

**V. Фізкультхвілінка.**

https://gisdapamoga.bspu.by/

**VI. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**Самастойная работа ў парах.**

Вучні выконваюць заданні.

Абазначце і падпішыце на карта-схеме: а) раку Прыпяць; б) тэрыторыю рассялення дрыгавічоў; в) гарады Тураў і Пінск.



**Храналагічная задача**

1. 980 г. — якое гэта стагоддзе?
2. Наколькі Полацк старэйшы за Тураў?
3. Колькі гадоў Тураву зараз?

**Адкажыце на пытанні**

- Якімі былі адносіны паміж Кіевам і Туравам?
- Дзякуючы чаму Тураўскае княства адстаяла сваю самастойнасць?
- У чым прычыны ўзвышэння горада Пінска?

**VII. Кантроль і карэкцыя засвоеных ведаў.**

Вучні выконваюць тэст, затым у парах правяраюць яго, ацэньваюць у балах вынікі сваёй дзейнасці.

**Тэст**

*Выберыце правільны варыянт адказу.*

1. Горад Тураў размяшчаецца ў басейне ракі:

а) Прыпяць;
б) Заходняя Дзвіна;
в) Бярэзіна.

2. Першае ўзгадванне пра Тураў адносіцца да:

а) 862 г.;
б) 912 г.;
в) 980 г.

3. Тэрыторыя Тураўскага княства ў асноўным адпавядала рассяленню:

а) крывічоў;
б) радзімічаў;
в) дрыгавічоў.

4. У канцы X ст. Уладзімір Святаславіч накіраваў у горад Тураў у якасці намесніка:

а) Святаполка;
б) Ізяслава;
в) Яраполка.

5. Імя тураўскага князя, які аднавіў незалежнасць сваёй зямлі ў 1157 г.:

а) Святаполк Ізяславіч;
б) Юрый Яраславіч;
в) Яраслаў Уладзіміравіч.

6. Ці з'яўляюцца дакладнымі наступныя сцвярджэнні:

а) калі верыць летапісу, у той час, калі ў Полацку княжыў Рагвалод, у Тураве гаспадарыў Тур;
б) тураўскія князі не аднойчы адначасова займалі і велікакняжацкі прастол у Кіеве;
в) Тураў да канца XII ст. з'яўляўся воласцю Кіеўскай зямлі.

7. Суаднясіце імёны і падзеі, якія былі з імі звязаны:

| | |
|---|---|
| 1) Тур;<br>2) Святаполк;<br>3) Ізяслаў Яраславіч;<br>4) Юрый Яраславіч | а) тураўскі князь, які з 1054 г. з'яўляўся і кіеўскім князем;<br>б) першы легендарны правіцель Турава;<br>в) тураўскі князь, які адстаяў незалежнасць свайго княства ад Кіева;<br>г) князь, які быў пасаджаны ў Тураве Уладзімірам Святаславічам |

1__; 2__; 3__; 4__.

8. Выкрэсліце лішняе:

а) да ліку найбольш буйных гарадоў Тураўскай зямлі адносяцца Тураў, Мсціслаў, Пінск, Ізяслаўль;
б) Святаполк Уладзіміравіч, Ізяслаў Яраславіч, Уладзімір Манамах, Юрый Яраславіч з'яўляліся і кіеўскімі, і тураўскімі князямі.

**VIII. Падвядзенне вынікаў урока, выстаўленне адзнак.**

Настаўнік прапануе ўспомніць, якія мэты ставілі вучні ў пачатку вывучэння тэмы, вызначыць, як яны дасягнулі гэтага і адказаць на пытанне «Ці можна Тураўскае княства лічыць дзяржавай?»

**IX. Дамашняе заданне. § 10.**

https://gisdapamoga.bspu.by/